УДК 069.01

# СВЯТОЧНАЯ КУЛЬТУРА БРЭСТА 1960-70-Х ГАДОЎ НА ФОТАЗДЫМКАХ (СА ЗБОРАЎ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МУЗЕЯ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ)

***А. У. Ціхаміраў***
*магістр культуралогіі, загадчык аддзела навукова-даследчай і экспазіцыйна-выставачнай работы*
*Беларусь, Гродна, УК «Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі»*

Артыкул прысвечаны адлюстраванню масавых святкаванняў у Брэсце ў 1960–1970-х гадах на фатаздымках са збораў Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі. Дадзеныя музейныя прадметы з'яўляюцца важнай візуальнай крыніцай для даследвання гарадской культуры, гістарычнай памяці і маладзёжнай палітыкі. На здымках паказаны святкаванні 950-годдзя Брэста ў 1969 г., пасвячэнне ў ганаровыя грамадзяне Брэста ў 1977 г., Дня Перамогі ў 1979 г., свята працоўнага рапарта чыгуначнікаў у 1979 г. і іншыя.

*Ключавыя словы:* музей, музейныя калекцыі, свята, юбілей, ганаровыя грамадзяне г. Брэста, Брэст.

Фатаграфіі для даследчыка XX стагоддзя з’яўляюцца важнымі гістарычнымі матэрыяламі, якія не проста дапаўняюць інфармацыю з іншых крыніц. На іх адлюстравана паўсядзённае жыццё людзей, знешні выгляд гарадоў і вёсак, розныя ўрачыстыя мерапрыемствы, побытавыя асаблівасці і эмоцыі. Фотаздымкі – гэта таксама частка культурнай памяці, матэрыяльныя аб'екты, якія паступова адыходзяць у нябыт разам з развіццём лічбавай фатаграфіі.

Святочная культура ў беларускіх гарадах пасляваеннага перыяду паступова трансфармавалася з улікам лакальных святочных традыцый, але з захаваннем агульных ідэалагічных рамак, прынятых у савецкай дзяржаве.

У 1970-1980-я гады супрацоўнікі Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі (ГДМГР) актыўна займаліся зборам прадметаў, звязаных з савецкай абраднасцю, укараннем свецкіх святаў і рытуалаў [1, с. 208]. Сярод іх фатаграфіі займаюць значную частку. Цікавасць уяўляюць здымкі з розных масавых святкаванняў у гарадах Беларусі, у тым ліку ў Брэсце.

24-25 мая 1969 г. адбыліся святочныя мерапрыемствы з нагоды 950-годдзя Брэста. 25 мая 1969 г. на стадыёне “Спартак” (сёння – абласны спартыўны комплекс “Брэсцкі”) адбылося тэатралізаванае прадстаўленне і спартыўнае свята пад назвай “Вясна 950-годдзя” [2, с. 319; 3, с. 339-340; 4; 5]. У фондах ГДМГР захоўваюцца 24 фатаграфіі, якія адлюстроўваюць гэтую падзею. Большасць з іх адлюстроўвае менавіта тэатралізаваную частку. Яна была арганізавана паводле адмысловага сцэнарыя, які павінен быў прадэманстраваць гледачам гістарычныя этапы развіцця горада. Падобнага тыпу візуалізацыя мінулага была дастаткова папулярнай формай для масавых святкаванняў пачынаючы з 1920-х гг.

На здымках можна пабачыць асноўныя механізаваныя платформы, якія выкарыстоўваліся падчас мерапрыемства, а таксама групы акцёраў. Гэтыя элементы прадстаўлення сімвалізавалі канкрэтныя гістарычныя падзеі ці этапы развіцця горада. Старажытнарускі перыяд быў прадстаўлены групай акцёраў, апранутых у стылізаваныя касцюмы княскіх дружыннікаў. На здымку бачна, што гэта былі ўдзельнікі ансамбля духавых інструментаў (у руках яны мелі трубы) (*фота 1*) [6].



***Фота 1 – Святкаванне 950-годдзя г. Брэста. 1969 г.***
***Фотапапера. Фотадрук чорна-белы. КП 614/19***

Механізаваная платформа, якая паказвала гэты перыяд была аформлена ў выглядзе старажытнай ладдзі з парусам (*фота 2*) [7].




***Фота 2 – Святкаванне 950-годдзя г. Брэста. 1969 г.***
***Фотапапера. Фотадрук чорна-белы. КП 614/16***

Таксама частка акцёраў у касцюмах дружыннікаў была вярхом на конях і са стылізаваным рыштункам. Часы барацьбы з крыжакамі адлюстраваны толькі на адным фотаздымку. Верагодна, што на платформе знаходзілася інсталяцыя ў выглядзе Камянецкай вежы (на здымку бачна толькі частка канструкцыі). Побач з ёй на кані перад гледачамі на стадыёне гарцаваў акцёр у касцюме крыжака [8]. Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі паказвалі акцёры ў форме чырвонаармейцаў. Асобная платформа была прысвечана заключэнню Брэсцкая міру ў 1918 г. На стылізаванай сцяне былі змешчаны плакаты з надпісамі “Брестский мир”, “Долой войну”, “Всем, всем, всем”. На здымку таксама бачныя постаці акцёраў, якія ігралі салдатаў [9]. Адлюстраваннем перыяду знаходжання заходнебеларускіх земляў у складзе Польшчы была механізаваная платформа са стылізаванай выявай канцэнтрацыйнага лагеру ў Бярозе Картузскай. Унутры канструкцыі знаходзіліся акцёры, якія гралі вязняў лагеру, а наверсе – акцёр у форме польскага ахоўніка са зброяй. Звонку на канструкцыі былі надпісы “Знесці з аблічча зямлі страшэнную катаргу ў Картуз-Бярозе!” і “Niech żyje walka przeciwko fabrykantom i obszarnikom!” (“Няхай жыве барацьба супраць фабрыкантаў і памешчыкаў!”) (*фота 3*) [10].




***Фота 3 – Святкаванне 950-годдзя г. Брэста. 1969 г.***
***Фотапапера. Фотадрук чорна-белы. КП 614/08***

Жыццё сялянаў дэманстраваў мужчына ў нацыянальнай вопратцы, які ішоў з плугам за канём, а таксама на іншым здымку – сейбіт. Была таксама асобная платформа, прысвечаная падзеям верасня 1939 г., упрыгожаная дзяржаўным сцягам Беларускай ССР і плакатамі з надпісамі “Навекі з’яднаны браты-беларусы” і “17 верасня 1939 г.”. На платформе знаходзіліся акцёры ў народных строях і у касцюмах чырвонаармейцаў (*фота 4*) [11].




***Фота 4 – Святкаванне 950-годдзя г. Брэста. 1969 г. Фотапапера. Фотадрук чорна-белы. КП 614/17***

Падчас мерапрыемства была паказана таксама платформа, якая сімвалізавала абаронцаў Брэсцкай крэпасці. На платформе знаходзілася выява сцяны, групы акцёраў, а таксама надпіс "Умираю, но не сдаюсь! Прощай Родина!" [12]. На здымках паказаны платформы, прысвечаныя перыяду нямецка-фашысцкай акупацыі і партызанскай барацьбы. На адной з іх была выява гарадскога будынку, афішнай тумбы і вялікі плакат з надпісам "Граждане г. Бреста! Вставайте все на борьбу с немецко-фашистскими захватчиками. Смерть немецким оккупантам!" [13].

На іншай платформе была паказана сцэна з падзеяў "рэйкавай вайны" [14]. На адным са здымкаў таксама можна пабачыць сцэну з жыцця партызанаў: узброеныя мужчына і жанчына канваіруюць афіцэра ў нямецкай форме (*фота 5*) [15]. Асобная платформа была прысвечана падзеям Вялікай Перамогі ў 1945 г. На ёй была змешчана вялікая выява медалю (аверс і рэверс) "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.", чырвоныя зоркі і чырвоны сцяг [16].



***Фота 5 – Святкаванне 950-годдзя г. Брэста. 1969 г. Фотапапера. Фотадрук чорна-белы. КП 614/01***

Пасляваенныя падзеі, аднаўленне горада і развіццё прамысловага патэнцыяла адлюстроўвалі механізаваныя платформы з выявай дзяржаўнага герба СССР, сярпа і молата, групы жанчынаў у нацыянальных касцюмах 15 саюзных рэспублік і плакатам з датамі “1919-1969” (гэтая платформа сімвалізавала 50-цігоддзе Савецкай Беларусі) [17]; з прадукцыяй Брэсцкага дыванoвага камбіната (вылучаўся дыван з выявай У. І. Леніна) [18]; прадукцыяй Брэсцкага электралампавага завода [19].

Асабліва вылучалася платформа з ганаровымі жыхарамі г. Брэста (Паўлам Мартынавічам Гулавым (1893-1972), Міронам Емельянавічам Крыштафовічам (1899-1985), Мікалаем Давыдавічам Свінарчуком (1920-1983) і Васілісай Сямёнаўнай Селівонік (1907-1990) (*фота 6*) [20].




***Фота 6 – Святкаванне 950-годдзя г. Брэста. 1969 г. Фотапапера. Фотадрук чорна-белы. КП 614/03***

Званне ганаровага грамадзяніна г. Брэста было ўстаноўлена 28 верасня 1967 года рашэннем 4-ай сесіі гарадскога Савета 11-га склікання. У савецкі перыяд яно надавалася за “актыўны ўдзел у рэвалюцыйнай барацьбе, за мужнасць і гераізм у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у Вялікай Айчыннай вайне, за асаблівыя заслугі ў галіне прамысловага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў г. Брэсце” [3, с. 307]. П. М. Гулаў, М.Д. Свінарчук і В.С. Селівонік атрымалі гэтыя ганаровыя званні напярэдадні святкаванняў – 23 мая 1969 г.

На здымках са стадыёна “Спартак” можна пабачыць трыбуны, поўнасцю запоўненыя гледачамі.

Святкаванне 950-годдзя Брэста пры ўсёй значнасці падзеі мела канешне лакальны, гарадскі характар. Больш важным юбілеем, які адзначаўся ў агульнадзяржаўным маштабе было святкаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. У музеі захоўваецца адзін фотаздымак, звязаны з гэтай падзеяй [21]. На ім паказана ўрачыстае пасяджэнне, якое адбывалася хутчэй за ўсё ў абласным камітэце КПБ ці абласным Савеце дэпутатаў.

У музеі захоўваюцца восем фатаграфій, якія адлюстроўваюць пасвячэнне ў ганаровыя грамадзяне г. Брэста ў 1977 годзе. На здымках можна пабачыць В.С. Селівонік [22], Аляксандра Аляксандравіча Лучынскага (1900-1990) (атрымаў званне ў 1975 г.) [23], Паўла Васільевіча Пранягіна (1916-1997) (атрымаў званне ў 1974 г.) (*фота 7*) [24] і іншых. На большасці з гэтых выяваў – сцэны ўзнагароджанняў і ўрачыстай пасадкі дрэваў.



***Фота 7 – Пасвячэнне ў ганаровыя грамадзяне г. Брэста. 1977 г. Фотапапера. Фотадрук чорна-белы. КП 772/08***




***Фота 8 – Свята Перамогі ў Брэсце. 1979 г. Фотапапера. Фотадрук чорна-белы. КП 615/14***

У 1977 годзе таксама быў зроблены здымак скульптурнай кампазіцыі “Кніга Гонару” у брэсцкім гарадскім парку [25].

На 21 здымку адлюстраваны Дзень Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў Брэсце ў 1979 годзе. На іх можна пабачыць цэлы шэраг святочных мерапрыемстваў. Сярод іх – ускладанне вянкоў ганаровымі грамадзянамі г. Брэста, урачыстасці на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці, стадыёне “Дынама” (раней – “Спартак”). Падчас тэатралізаванага і спартыўнага прадстаўлення на стадыёне, як і ў 1969 г. былі выкарыстаныя механізаваныя платформы. Яны сімвалізавалі гарады-героі Савецкага Саюза. На адным з іх на першым плане адлюстравана платформа ў гонар Валгаграда (*фота 8*) [26]. Таксама ў мерапрыемствах прымалі ўдзел розныя прафесійныя і аматарскія творчыя калектывы.

У 1979 годзе таксама адбылося Свята працоўнага рапарта чыгуначніка [27]. Брэст з’яўляецца важным транспартным вузлом, прадпрыемствы і арганізацыі чыгункі ў савецкі час мелі істотнае значэнне для гаспадаркі горада. На чатырох здымках паказаны ўрачыстыя сходы з нагоды гэтых святкаванняў на свежым паветры і ў памяшканні (меркавана, што ў Палацы культуры чыгуначнікаў) (*фота 9*). Працоўны рапарт уяўляў сабой спецыяльны дакумент, у якім пералічваліся канкрэтныя дасягненні працоўнага калектыву (ці нават працаўнікоў цэлай галіны) за перыяд пяцігодкі. У большасці выпадкаў, апісваліся факты перавыканання паказчыкаў ці датэрміновага іх выканання [28].




***Фота 9 – Свята працоўнага рапарта чыгуначніка ў Брэсце. 1979 г. Фотапапера. Фотадрук чорна-белы. КП 771/04***

У 1979 годзе ў Брэсце адбылося свята “Брэсцкая сняжынка-79”. Яно мела масавы забаўляльны характар і праходзіла на тэрыторыі гарадскога парка. На васьмі здымках адлюстраваны праезд механізаваных платформ з Дзедам Марозам, Снягуркай, іншымі міфалагічнымі і фальклёрнымі персанажамі да парка, прадстаўленне на эстрадзе, народныя гулянні (*фота 10*) [29].




***Фота 10 – Свята “Брэсцкая сняжынка-79”. 1979 г. Фотапапера. Фотадрук чорна-белы. КП 773/04***

Фотаздымкі са святкаванняў розных падзей у Брэсце 1960-1970-х гадоў з’яўляюцца каштоўнымі візуальнымі крыніцамі не толькі для гісторыкаў, але таксама для сацыёлагаў, культуролагаў, спецыялістаў іншых гуманітарных

дысцыплін. Дадзеныя музейныя прадметы дазваляюць больш падрабязна даследваць гарадскую культуру, пытанні гістарычнай памяці і маладзёжную палітыку. Яны паказваюць важнасць масавых святкаванняў для тагачаснага грамадства і актыўны ўдзел розных пакаленняў у іх. Варта таксама заўважыць, што арганізатары святочных мерапрыемстваў рабілі асаблівы націск на справу пераемнасці паміж рознымі пакаленнямі і заахвочванне моладзі для актыўнага ўдзелу ў мерапрыемствах.

Спіс крыніц і літаратуры:


1. Ціхаміраў, А. У. Прадметы з Гомеля і Гомельскай вобласці ў фондах Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі / А. У. Ціхаміраў // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX-XXI стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы: матэр. Рэсп. навук. канф. (Гомель, 14 кастр. 2021 г.) / рэдкал.: А.Р. Яшчанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2021. – С. 206-210.
2. Брест. Брэст. Brest. 1000 / сост. А. Н. Вабищевич. – Мінск : БелЭн, 2019. – 456 с.: ил.
3. Брест. Энц. справочник / редколл. И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелСЭ, 1987. – 408 с.: ил.
4. Вабищевич, А. Н. Как отмечали 950-летие Бреста в 1969-м (+ фото) / А. Н.Вабищевич. – Рэжым доступу : http://bvn.by/news/obshestvo/kak-otmechali-950-letie-bresta-v-1969-m-foto/. – Дата доступу : 04.11.2023.
5. Как отмечалі 950-летие Бреста в 1969 году. – Рэжым доступу : https://brestjust.gov.by/news/kak-otmechali-950-letie-bresta-v-1969-godu/. – Дата доступу : 04.11.2023.
6. Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі (ГДМГР). – Навуковы пашпарт КП 614/19.
7. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/16.
8. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/09.
9. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/23.
10. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/08.
11. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/17.
12. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/13.
13. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/11.
14. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/24.
15. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/01.
16. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/15.
17. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/12.
18. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/18.
19. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/20.
20. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 614/03.
21. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 777.
22. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 772/03.
23. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 772/06.
24. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 772/08.
25. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 778.
26. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 615/14.
27. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 771/01-04.
28. Трудовой рапорт бригады Скорова В. Н. на заводском празднике труда. – Рэжым доступу : https://archivogram.top/31360885-trudovoy_raport_brigady-_skorova_wladimira_nikolaevicha_na_zavodskom_prazdnike_truda?ysclid=lpju3367zy88452107. – Дата доступу : 04.11.2023.
29. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 773/01-08.